*А. У. Ерашэвіч*
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, Мінск

*A. V. Yerashevich*
Belarusian State Economic University, Minsk

**УДК 271.4(476)(091)**

# УДЗЕЛ ДЗЯРЖАВЫ Ў ФІНАНСАВАЙ ПАДТРЫМЦЫ ДЗЕЙНАСЦІ ЎНІЯЦКАЙ ЦАРКВЫ Ў БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯХ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ (КАНЕЦ XVIII СТ. – 30-Я ГГ. XIX СТ.)

# STATE PARTICIPATION IN FINANCIAL SUPPORT OF THE ACTIVITIES OF THE UNIATE CHURCH IN THE BELARUSIAN PROVINCES OF THE RUSSIAN EMPIRE (LATE 18TH CENTURY – 1830s)

*У артыкуле раскрываюцца асноўныя крыніцы грашовага забеспячэння дзейнасці ўніяцкай царквы на тэрыторыі беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў канцы XVIII – 30-х гг. XIX ст. Вызначана роля дзяржавы ў фінансавай падтрымцы ўніяцкай канфесіі. Нетрывалы, нявызначаны цалкам імператарскай уладай статус уніяцкай царквы абумовіў адсутнасць яе пастаяннага дзяржаўнага фінансавання. Уніяцкая царква на беларускіх землях у гэты перыяд забяспечвалася пераважна за кошт уласных фундушавых крыніц даходаў. Асобныя грашовыя асігнаванні з дзяржаўнага казначэйства прызначыліся для ўтрымання вышэйшых уніяцкіх іерархаў, пенсійнага забеспячэння нязначнай часткі парафіяльнага духавенства, якая пазбавілася сваіх прыходаў пасля пераводу ўніятаў у праваслаўе, а таксама нязначнай часткі кансісторскіх служачых, нешматлікіх выкладчыкаў духоўных навучальных устаноў.*

*Ключавыя словы: уніяцкая царква; грашовае забеспячэнне; фінансавая падтрымка; дзяржаўныя асігнаванні; беларускія губерні.*

*The article reveals the main sources of financial support for the activities of the Uniate Church in the territory of the Belarusian provinces of the Russian Empire in the late18th – 30s of the 19th century. The role of the state in the financial support of the Uniate denomination is defined. The unstable status of the Uniate Church, which was completely undefined by the imperial government, led to the lack of permanent state funding. During this period, the Uniate Church in the Belarusian lands was supported mainly by its own per capita sources of income. Separate financial allocations from the state treasury were allocated for the maintenance of the higher Uniate hierarchs, pension provision for a small part of the parish clergy who lost their parishes after the Uniates converted to Orthodoxy, as well as a small part of the consistorial staff, and a few teachers of theological educational institutions.*

*Keywords: Uniate Church; monetary allowance; financial support; state appropriations; Byelorussian provinces.*

Разнастайныя формы і напрамкі дзейнасці ўніяцкай канфесіі на беларускіх землях у часы Расійскай імперыі ў 1772–1839 гг. дагэтуль прыцягваюць увагу гісторыкаў, філосафаў, філолагаў, мастацтвазнаўцаў і іншых суб’ектаў сацыяльна-гуманітарных дысцыплін. Павялічваецца колькасць

даследчыкаў і прадметнае поле вывучэння ўніяцкай праблематыкі. Шматлікія працы прадстаўнікоў рэлігійнай і свецкай плыней расійскай, польскай, айчыннай гістарыяграфіі за больш чым 200-гадавы перыяд сведчаць аб неадназначнай ацэнцы месца і ролі ўніяцкай дэнамінацыі на беларускіх землях пад расійскім панаваннем у сацыяльна-эканамічнай, грамадска-палітычнай, духоўна-культурнай сферах жыццядзейнасці грамадства, шляхах і метадах распаўсюджвання ці наадварот змяншэння яе ўплыву, перадумовах, ходзе і наступствах скасавання грэка-каталіцтва. У навуковых творах беларускіх даследчыкаў прысутнічаюць альтэрнатыўныя трактоўкі, выказваюцца дыскусійныя погляды па гісторыі функцыянавання ўніяцкай царквы на беларускіх землях у 1770–1830-х гг. У працах шэрагу беларускіх свецкіх (А. Філатава, У. Сосна, П. Шэўкун і інш.) і царкоўных (М. Наско, А. Раманчук, А. Хацееў, В. Шэсцітка і інш.) гісторыкаў разглядаюцца розныя аспекты палітыкі расійскіх улад адносна ўніяцкай царквы беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў працэсе выпрацоўцы стратэгіі і асноўных напрамкаў рэгулявання дзяржаўна-канфесійных адносін, форм і сродкаў міжканфесійнага ўзаемадзеяння, даследуецца паўсядзённае жыццё ўніяцкага духавенства (Д. В. Лісейчыкаў), адносіны ўніяцкага кліра і вернікаў да палітыкі расійскіх улад па рэфармаванні і скасаванні ўніяцкай царквы, этнакультурныя аспекты дзейнасці ўніяцкай канфесіі, яе значэнне для станаўлення этнакультурнай ідэнтычнасці беларускай нацыі (С. В. Марозава, Л. М. Лыч), гісторыка-культурная спадчына ўніяцкай царквы (А. А. Суша, Г. А. Флікоп-Світа) і інш. Сярод кніг і артыкулаў прадстаўнікоў сучаснай гістарыяграфіі па ўніяцкай тэмытыцы перыяду канца XVIII – 30-х гг. XIX ст. трэба адзначыць працы, якія былі заснаваныя на выкарыстанні даволі значнай архіўнай дакументальнай базы (даследаванні М. М. Галанава [1 і інш.], Д. В. Лісейчыкава [2; 3 і інш.], С. В. Марозавай [4; 5 і інш.] А. Філатавай [6; 7 і інш.], М. Радвана [8 і інш.] і іншых аўтараў. Артыкул Ю. Аўчыннікавай прысвечаны арганізацыі і вызначэнні функцыянальных абавязкаў у дзейнасці Полацкай ўніяцкай духоўнай кансісторыі пры яе першых архірэях у канцы XVIII – першым дзесяцігоддзі XIX ст. [9]. Прадметам навуковых зацікаўленняў Л. І. Масейчук стала падрыхтоўка кадраў уніяцкага прыходскага духавенства ў духоўных навучальных установах на беларускіх землях у 1743–1839 гг. [10]. Шматаспектнасць тэматыкі і неабходнасць поўнага і ўсебаковага вывучэння дзейнасці ўніяцкай царквы ў вызначаных тэрытарыяльных і храналагічных рамках абумовілі зварот аўтара да рэканструкцыі працэсу фінансавага забеспячэння жыццядзейнасці ўніяцкай канфесіі.

Мэта артыкула зводзіцца да вызначання месца і ролі дзяржаўных фінансавах рэсурсаў у забеспячэнні жыццядзейнасці ўніяцкай царквы ў беларускіх губернях Расійскай імперыі ў канцы XVIII – 30-х гг. XIX ст. на фоне адлюстравання грашовых крыніц яе матэрыяльнага існавання. Крыніцавай базай працы стала выкарыстанне значнага комплексу разна-

планавых апублікаваных і неапублікаваных дакументаў і матэрыялаў: заканадаўчых актаў з Поўнага збору законаў Расійскай імперыі, афіцыйнай справаводнай дакументацыі, статыстычных звестак.

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай і далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі ў яе складзе апынуліся ўніяцкія вернікі, якія колькасна пераважалі ў канфесійнай структуры хрысціянскага насельніцтва, асабліва ў сельскай мясцовасці. У канцы 1772 г. у духоўнае кіраванне ўніяцкага архіепіскапа Ясона Смагаржэўскага, пры якім арганізоўвалася духоўная кансісторыя з 2–3 духоўных асоб па яго меркаванню, паступілі грэка-каталіцкія манастыры і прыходскія цэрквы з духавенствам і прыхаджанамі ў Магілёўскай і Пскоўскай (з 24.08.1776 г. Полацкай) губернях. Захоўваліся існуючыя дагэтуль крыніцы матэрыяльнага ўтрымання ўніяцкага іерарха [11, т. 19, № 13922, с. 688, 689]. Уніяцкая царква здолела захаваць цэласнасць сваёй маёмасці.

Згодна з імператарскім указам ад 6.09.1795 г. уніяцкія манастыры і цэрквы Мінскай губерні былі прыпісаны да Беларускай праваслаўнай епархіі. З грашовых даходаў далучаных да Расійскай імперыі Мінскай, Валынскай, Падольскай, Брацлаўскай губерняў трэба было адлічваць пенсійнае ўтрыманне вышэйшым духоўным асобам грэка-каталіцкай царквы, якія засталіся без пасад пасля скасавання імператрыцай Кацярынай II уніяцкіх епархій: мітрапаліту Феадосію Растоцкаму 6 тыс. руб., суфрагану-епіскапу брэсцкаму Адрыяну Бутрымовічу і пінскаму епіскапу Іоакіму Гарбацкаму па 3 тыс. руб. штогод. Кожнаму з уніяцкіх святароў, якія заставаліся без месцаў (прыходаў), пажыццёва прызначалася да выплаты на ўтрыманне з агульных губернскіх даходаў ад 50 да 100 руб. [11, т. 23, № 17384, с. 772–773; № 17391, с. 792].

Пераемнік Кацярыны II імператар Павел I 28.04.1798 г. аднавіў дзейнасць ранейшай Полацкай уніяцкай архіепархіі на чале з Іракліем Лісоўскім у Беларускай губерні і стварыў новую Брэсцкую ўніяцкую епархію, улада якой распаўсюджвалася на тэрыторыі Мінскай і Літоўскай губерняў. Полацкі архіепіскап І. Лісоўскі меў 18 тыс. руб. серабром (далей – сер.) гадавога жалавання. Кіраўнік Брэсцкай епархіі Арсені Глаўнеўскі (пазней епіскап-суфраган пінскі і тураўскі Іосафат Булгак) атрымліваў 6 тыс. руб. жалавання штогод [12, s. 246]. Пацвярджалася права на пажыццёвыя пенсіі для былых уніяцкіх іерархаў мітрапаліта Ф. Растоцкага, епіскапаў А. Бутрымовіча, І. Гарбацкага, з дадаткам пінскага епіскапа І. Булгака пры ўмове іх размяшчэння ў гарадах ці манастырах расійскай дзяржавы [11, т. 25, № 18503, с. 222]. Калі новы імператар у красавіку 1797 г. высветліў, што выдача прызначаных указам Кацярыры II безместным уніяцкім святарам пенсійных грошай затрымлівалася, ён распарадзіўся аб неадкладнай іх выплаце [13, с. 572]. У 1797 г. уніяцкія «папы», якія пазбавіліся сваіх прыходаў пасля далучэння грэка-каталіцкіх вернікаў да праваслаўя, маглі

разлічваць на грашовыя пенсійныя кампенсацыі з боку дзяржавы: адзінокія ўніяцкія прыходскія свяшчэннікі, якія засталіся без пасад, на 50 руб. штогод кожны, жанатыя з дзецьмі (тыя, хто меў сям'ю) і валодаў нейкай уласнасцю (дамы, землі, жывёла, пасекі і інш.) – на 75 руб., сямейныя (маючыя жон і малалетніх дзяцей) без уласнасці – на 100 руб. [14, с. 557]. Каля 1798 г. у Беларускай губерні аказалася 65, а ў Мінскай 74 чал. безприходных уніяцкіх капланаў [8, s. 443–448]. Па падліках М. М. Галанава, прыкладна 60 % безместных святароў (41 па спісу ў Пінскім, Мазырскім, Рэчыцкім, Бабруйскім, Слуцкім паветах Мінскай губерні) не мелі патрэбу ў грашовай дзяржаўнай датацыі, паколькі маглі сябе пракарміць самі [15, с. 339–341, 527–530]. Па стану на 1797 г. у паветах Мінскай губерні было 371 уніяцкіх прыходскіх цэркваў і 309922 прыхаджан [16, арк. 154–182], таму пенсійныя выплаты закранулі нязначную частку уніяцкіх прыходаў.

Згодна з вышэй зацверджаным 27.09.1804 г. дакладам Сената быў вызначаны прыкладны штат для 3 уніяцкіх кансісторый для 9 службовых асоб. Канцылярскія чыны маглі атрымоўваць жалаванне па меркаванні епархіяльных архірэяў з іх уласных даходаў [11, т. 28, № 21467, с. 536; т. 44-2, отд. 4, к № 21467, с. 45]. Паводле імператарскага ўказа ад 14.02.1809 г. аднаўлялася дзейнасць Літоўскай уніяцкай мітрапаліцкай епархіі, якой вылучаліся для ўтрымання сталовыя маёнткі (фальваркі Вака, Шэйхоле, Навагрудак, Рута і Быкевічы). Цэрквы і манастыры знішчанай Супрасльскай епархіі пасля далучэння Беластоцкай вобласці да Расійскай імперыі ўключаліся ў склад Брэсцкай епархіі. У Вільне для кіравання мітрапаліцкай епархіі засноўвалася кансісторыя і прызначаўся суфраган. Вызначаныя ад прускага ўрада 4 тыс. талераў супрасльскаму епіскапу пароўну размяркоўваліся для выдачы жалавання брэсцкаму суфрагану і на ўтрыманне кансісторыі. Брэсцкаму епіскапу з архірэйскім штатам прызначаўся пенсіён з даходамі ад духоўных маёнткаў [11, т. 30, № 23482, с. 786; т. 31, № 24118, с. 61]. Беларускія землі ўвайшлі ў склад Літоўскай мітрапаліцкай, Полацкай архіепіскапскай і Брэсцкай епіскапскай уніяцкіх епархій.

Утрыманне полацкага архіепіскапа І. Лісоўскага, які мясціўся з кансісторыяй і кафедральным духавенствам у Ануфрэйскім манастыры ў Чэрыкаўскім павеце, забяспечвалася з даходаў фальваркаў духоўных маёнткаў Струнь, Замшаны, Заронава, Папіно і Ануфрэйскай архімандрыі. Згодна з ведамасцю 1800 г. гэтыя ўладанні давалі 5750 руб. асігнацыямі (далей – ас.) прыбытку, з якіх выплачвалася 1978,29 руб. ас. (34,4 %) у год казённых падаткаў [17, с. 12].

Асобныя зборы збіраліся з уніяцкага прыходскага духавенства. Пры рукапалажэнні за набыццё рознага роду епіскапскіх грамат і за інсталяцыю права пажыццёвага кіравання настаяцелю прыхода трэба было заплаціць да 50 руб. ас. (адміністрацыя давала права кіраваць прыходам на працягу 3 гадоў). Кожны з большасці грэка-каталіцкіх святароў за перамену і пер-

шае атрыманне богаслужбовага месца павінен быў здаць па 3 руб. ас. Полацкая епархія падзялялася на 10 протапрэсвітэрый і 28 дэканатаў. Дэканы спаганялі асобную плату па 1,5 кап. з кожнага прыходскага дома святароў [17, с. 297, 299].

Шматлікімі былі крыніцы матэрыяльнага існавання ўніяцкага прыходскага духавенства. Святары прыходаў забяспечваліся за кошт фундушавай зямлі, якую апрацоўвалі сяляне (у Магілёўскай губерні было 190, а ў Віцебскай 547 душ, разам 737 духоўных сялян муж. полу), у некаторых была ардынарыя. У 27 прыходах збіралі т.зв. снопавую дзесяціну з сялян у залежнасці ад колькасці засеву палёў зернем (у большасці гэтых прыходаў збіралі дзесяціну на карысць памешчыка і цэркваў). Прыходскія даходы святароў уключалі плату за трэбы (адправы) і зборы перад Калядамі (каляда) восенню («паездка па малітве»). Па ўказу ад 3.04.1801 г. за вяселле ці за пахаванне дарослага належыла выплаціць 20 кап., за хрышчэнне немаўляткі ці дзіця – 6 кап., за малітву ў гонар маці – 4 кап. Гэтыя грашовыя паступленні збіралі ніжэй указной нормы: як правіла, за хрышчэнне ўніяцкі святар браў 5 кап., дзячок – 1–2 кап., а за пахаванне і за шлюб па дамове [17, с. 13, 14, 16].

Адной з крыніц даходаў уніяцкай царквы выступалі працэнты з капіталаў, завешчаных кціцарамі ці прыватнымі асобамі на карысць уніяцкіх цэркваў і манастыроў. Даныя аб колькасці і відах капітальных сум былі няпоўнымі і няпэўнымі. Так, у 1800 г. на духавенстве Полацкай уніяцкай епархіі было запісана 2060 руб. надзейных капіталаў, з якіх паступала 103 руб. працэнтаў, паводле ведамасці 1805 г. капітальная сума складала 3735 ці 3800 руб., у 1807 г. – 14667,5 руб. і 3040 талераў, да 1817 г. (па няпоўных звестках) пры 5 уніяцкіх цэрквах у Віцебскай і 3 у Магілёўскай губерні было паказана 855 талераў, 2481 руб. сер., 2400 руб. ас. Уніяцкае манаскае духавенства базыльян мела даход ад зямельных угоддзяў, якія апрацоўвалі прыгонныя сяляне (у Віцебскай губерні 4572, у Магілёўскай – 2576, разам 7148 мужчын). Па стану на 1810 г. капітальныя сумы базыльян у Віцебскай губерні даходзілі да 1316 злотых, 26130 талераў, 14015 руб. сер. і 148286,35 руб. ас., у Магілёўскай губерні – да 216 злотых, 1 тыс. талераў, 3410 руб. сер. і 62711,12 руб. ас. Да таго ж, базыльянскі правінцыял вызначыў грашовую складчыну з правінцыі ў памеры 398 руб. ас. і 35 руб. сер. Падкрэслім імкненне базыльянскага чорнага, як і прыходскага (белага) уніяцкага духавенства схаваць ад урадавага ўліку частку капіталаў і атрымліваемых даходаў [17, с. 15, 17].

Як і ў Полацкай, у Літоўска-Віленскай мітрапаліцкай уніяцкай епархіі манаскае (чорнае) духавенства базыльянскага ордэна (даныя за 1814 г.) было больш заможным, чым прыходскія (белыя) свяшчэнна і царкоўнаслужыцелі (звесткі за 1811 г.). Прынамсі, калі фундушавыя капіталы чорнага духавенства складалі суму ў 146533,68 руб. сер. (115373,64 руб. над-

зейныя, 14939,57 руб. недакладныя, 16220,47 руб. страчаныя), то белага толькі ў 8245 руб. Даходы з сялян, дзесяціны, працэнтаў, жалавання базыльян дасягалі 20039,58 руб. (дакладныя 18074,92 руб., недакладныя 1964,66 руб.), а грашовыя прыходы прыходскага духавенства ад аннуатаў, дзесяціны, працэнтаў і жалавання вызначаліся сумай у 10017,68 руб. (дакладныя ў 5208,79 руб., недакладныя ў 4808,89 руб.). Плацяжы на манахаў, цэрквы, царкоўных служыцеляў і зямлі складалі ў чорнага ўніяцкага духавенства 16548,22 руб., белага – 11413,6 руб. Але адлічэнні ў дзяржаўную казну размяркоўваліся амаль пароўну: базыльяне здавалі ў дзяржаўныя касы 3787,99 руб., а прыходскае духавенства 3491,7 руб. [14, с. 681–683, 686–687].

За 1822 г. у Літоўска-Віленскай мітрапаліцкай, Полацкай і Брэсцкай уніяцкіх епархіях было налічана з капітальных сум іпатэчных працэнтаў: белага (прыходскага) духавенства 55 чырвонцаў, 23189,89 руб. сер., 1500 руб. ас., 21 талер, чорнага (манаскага) – 750 чырвонцаў, 160843,37 руб. сер., 3500 руб. ас., 1300 талераў [18, прилож., с. 132].

Полацкая ўніяцкая кансісторыя, як адміністрацыйна-судовая ўстанова аднайменнай архіепархіі, складалася з 5 духоўных асоб (старшыня ці афіцыял, віцэ-афіцыял, 3 асэсары), свецкіх сакратара, рэгістратара, пратакаліста, перакладчыка, 4 канцылярскіх служкаў, 2 вартавых. Члены і служачыя кансісторыі жылі ад даходаў архіепіскапскіх маёнткаў на адзведзеных ім кватэрах. На стол афіцыялу і віцэ-афіцыялу належыла выплачваць па 200 руб., асэсарам – па 150 руб., сакратару – 250 руб., рэгістратару – 120 руб., пратакалісту і перакладчыку – па 130 руб., канцылярскім службоўцам – па 100 руб., вартавым – па 25 руб., разам 1930 руб. [17, с. 295, 296–297]. Жалаванне членаў кансісторыі было непастаянным, а яго сумы размякоўваліся па ўласным меркаванні архіепіскапа. Але ў 1822 г. штат уніяцкай кансісторыі Полацкай епархіі набыў больш-менш пастаянныя памеры, і былі вызначаны пэўныя сумы для выдачы жалавання службоўцам: афіцыял атрымліваў 800 руб., віцэ-афіцыял – 600 руб., 3 засядацелі – па 500 руб., сакратар – 450 руб., пратакаліст і перакладчык – па 300 руб., 3 канцылярсты – па 200 руб., 2 вартавых – па 100 руб., на ўтрыманне памяшкання, яго ацяпленне, асвятленне, канцылярскія расходы адпускалася 500 руб., разам 5250 руб. Іншымі словамі, грашовае ўтрыманне Полацкай кансісторыі было падвышана ў 2,72 раза [17, с. 297]. Члены кансісторыі, канцылярскія чыноўнікі і служыцелі Беларускай кансісторыі ў 1829 г. атрымлівалі ад епіскапа Я. Мартусевіча жалаванне штогод наяўнымі грашыма па ранейшаму акладу архіепіскапа І. Красоўскага: афіцыял 200 руб., віцэ-афіцыял 180 руб., 3 асэсары па 160 руб., сакратар 300 руб., пратакаліст 160 руб., рэгістратар 125 руб., павытчык 120 руб., перакладчык замест 300 ужо 150 руб., 2 капіісты не па 100, а па 50 руб., усяго 1815 руб. ас. з даходаў маёнткаў уніяцкай царквы [14, с. 985].

У 1809 г. брэсцкі епіскап меў даходы ад 4 фальваркаў з 430 душамі сялян мужчынскага полу. Афіцыял Брэсцкай епархіі атрымоўваў 600 руб., а віцэ-афіцыял 450 руб. з даходаў біскупскіх уладанняў у памеры 2700 руб. сер. У 1816 г. на ўтрыманне 5 членаў Віленскай уніяцкай кансісторыі выдаткоўвалася 1915 руб., у тым ліку старшыні 700 руб., яго памочніка 450 руб., 3 асэсараў па 255 руб. [8, s. 44, 47].

Пасля прынятага ў канцы 1827 г. урадам курса на адарванне ўніяцкай царквы ад рымска-каталіцкай і зближэння яе з праваслаўнай згодна з імператарскім указам ад 8.06.1828 г. была вылучана асобная грэка-уніяцкая духоўная калегія, а колькасць уніяцкіх епархій з кансісторыямі пры ніх была скарочана з 4 да 2: Літоўскай з цэнтрам у Жыровічах і Полацкай (Беларускай) з рэзідэнцыяй у Полацку.

Зразумела, што найвышэйшыя сумы грашовага ўтрымання мелі ўніяцкія іерархі па некалькіх займаемых імі пасадах. Так, у 1829 г., калі І. Сямашка стаў вікарным епіскапам Беларускай уніяцкай епархіі, яму звыш сталовых грошай па 100 руб. ас. штомесячна, з дзяржаўнай казны было вызначана па 1000 руб. сер. штогоднага жалавання з зваротам грошай з духоўных фундушаў. Згодна з указам грэка-каталіцкай калегіі ад 19.05.1833 г. з прычыны прызначэння І. Сямашкі Літоўскім епархіяльным епіскапам яму выдавалася 1875 руб. штатнага жалавання як члену ўніяцкай духоўнай калегіі, 1200 руб. сталовых і яшчэ належыла адлічыць 3000 руб., якія прызначаліся былому брэсцкаму епіскапу і мітрапаліту І. Булгаку. Да таго ж, 18.04.1839 г. І. Сямашку была прызначана пажыццёвая пенсія ў памеры 6000 руб. ас. на той жа аснове, як пры Кацярыне ІІ аказвалася грашовая дапамога ўніяцкім епархіяльным епіскапам [19, т. 1, с. 128, 563–564, 743]. Такім чынам, І. Сямашка супольна атрымліваў 12075 руб. ас.

У другой палове 1820-х гг. у Беларускай уніяцкай епархіі фундуш уключаў каля 3500 сялянскіх душ і больш 120 тыс. руб. ас. капіталу, у Віленскай – больш 500 душ сялян мужчынскага полу і юрыздыкі ў Вільне і Навагрудку. На ўтрыманне Брэсцкай епархіі паступала з дзяржаўнай казны 3000 руб. пры фундушу з епіскапскіх маёнткаў з больш чым 500 душамі сялян мужчын. Кансісторыі і вікарнаму епіскапу адлічалася з дзяржаўнага казначэйства 4000 талераў ці 19152 руб. ас. [20, с. 531; 21, с. 625]. Літоўская ўніяцкая кансісторыя атрымлівала, як былая Брэсцкая, 2000 талераў ці 9576 руб. ас., нягледзячы на тое, што колькасць спраў у ёй было больш амаль у 3 разы. Беларускай грэка-уніяцкай духоўнай кансісторыі да ранейшага ўтрымання было дабаўлена 2000 руб. ас. з даходаў Жыдзічанскай бенефіцыі (запіска ад 15.11.1833 г.) [19, т. 1, с. 678, т. 3, стб. 36].

Да 1830 г. з даходаў Полацкай архіепіскапіі на ўтрыманне духоўнай кансісторыі паступала 1815 руб. ас. у год. З 1830 г. да гэтай сумы было дадана яшчэ 2 тыс. руб. ас. з даходаў Жыдзічанскай бенефіцыі і ад прыбыткаў Полацкага архіепіскапства было дазволена выкарыстоўваць «на даўгі» і ква-

тэры некаторых чыноўнікаў 3590 руб. ас. Тым не менш, вызначанага членам кансісторыі жалавання да 1833 г. не выплачвалася, а полацкі архіепіскап размяркоўваў сумы па сваім меркаванні, а не па штатных роспісах. З 1833 г., калі мітрапаліт І. Булгак пераехаў у Пецярбург, а духоўныя маёнткі здаў у арэнду, ён прызначыў кватэрныя і сталовыя грошы з уласных даходаў членам кансісторыі і саступіў на яе карысць яму належачы збор за міро з усіх уніяцкіх цэркваў Беларускай епархіі. Аднак гэтыя грашовыя адлічэнні былі нязначнымі [22, с. 365]. У 1833 г. фундуш Полацкага архіепіскапа быў падзелены на 2 часткі: 1300 сялян мужчын засталіся для ўтрымання епіскапа з кансісторыяй, а 1800 душ і капітал у 200 тыс. руб. выдаткоўваліся для забеспячэння дзейнасці епархіяльнай семінарыі [23, с. 545].

У другой палове 1830-х гг. фундушы полацкага архіепіскапа ўключалі Ануфрыеўскую архімандрыю (986 душ мужчын і 10229,6 руб. ас. даходу), архіепіскапскія маёнткі, раскіданыя ў Віцебскім, Полацкім, Дрысенскім, Сенненскім паветах (1646 душ сялян мужчынскага полу, 27 тыс. руб. прыбытку). Працэнты ад мітрапаліцкай сумы ў 58587,51 руб. ас., размешчанай у Пазыковым банке, давалі больш 40 тыс. руб. ас., з якіх каля 5 тыс. руб. вылучалася на ўтрыманне кансісторыі [22, с. 32–33].

Вышэйшае белае і пераважна гарадское (асабліва полацкае) уніяцкае духавенства, члены кансісторыі, некаторыя прафесары семінарыі забяспечваліся за кошт фундушаў сельскіх цэркваў. З 1829 г. віцэ-старшыня Полацкай кансісторыі займеў 450 руб. ас. замест 180 руб., засядацелі па 300 руб. ас. замест ранейшых 160 руб. кожнаму, з дадаткам натурай кватэры, дроў, прысланых харчовых прадуктаў, лекаў, палатна, бясплатнага праезду. У першыя гады праўлення І. Булгака члены Беларускай уніяцкай епархіі замест натуральных дач атрымлівалі 300 руб. ас. у год сталовых грошай [22, с. 33].

Большасць гарадскіх і сельскіх уніяцкіх прычтаў Беларускай епархіі жылі за кошт уласных крыніц матэрыяльнага дабрабыту. Лепш былі забяспечаны ўніяцкія цэрквы ў Аршанскім і Копыскім паветах, кожная з якіх мела да 500 руб. ас. даходу, але большасць уніяцкіх прыходаў былі незаможнымі. Самымі беднымі лічыліся ўніяцкія прычты ў Полацкім, Лепельскім, Дзісенскім паветах, якія мелі да 200 руб. утрымання на кожную. Казённае жалаванне не выплачвалася ніякім уніяцкім прычтам. Дадатковя сродкі матэрыяльнага забеспячэння паступалі ад мясцовых ксяндзоў і памешчыкаў. У прыватнасці, ад землеўладальніка Паульскай царкве пералічалася 75 руб. у год [22, с. 33–34, 35].

Асобныя дзяржаўныя грашовыя асігнаванні на карысць уніяцкай царквы рабіліся пасля прыняцця канчатковага рашэння аб яе аб’яднанні з праваслаўнай і рэалізацыі падрыхтоўчых мерапрыемстваў па ажыццяўленні гэтай урадавай задумы. У 1834 г. для аздаблення цэркваў было падаравана ў Беларускую і Літоўскую ўніяцкія епархіі па 5000 руб. штогод

з сумы, прызначанай для заснавання ў Полацку духоўнай уніяцкай акадэміі [23, с. 661]. З 5.11.1835 г. міністр фінансаў займеў права асігнавання з дзяржаўнай казны для ўладкавання іканастасаў, прастолаў і начыння для грэка-уніяцкіх храмаў у казённых маёнтках (паселішчах) суму да 300 руб. сер. на кожную царкву [19, т. 3, стб. 240; 24, т. 10-2, № 8544, с. 1080–1081].

Больш дакладныя звесткі аб крыніцах даходаў уніяцкай царквы былі сабраны ў час рэвізіі яе маёмасці напярэдадні скасавання. Агульныя даходы з нерухомых маёнткаў, капіталаў, дзесяцін, аннуат мужчынскіх і жаночых манастроў, а таксама белага духавенства Беларускай і Літоўскай уніяцкіх епархій у 1837 г. вызначаліся сумай у 155805,18 руб., у 1838 г. – у 172137,61 руб. [25, вед. № 19, 20, 21, с. 225–237; 26, вед. № 19, 20, 21, с. 101–113]. Ахвяраванні на ўніяцкія цэрквы ў 1837 г. за кошт скарбоначнага, кашальковага збораў і даходаў з маёнткаў склалі 26120,17 руб., у 1838 г. – 21978,86 руб. [25, вед. № 25, с. 251–252; 26, вед. № 25, с. 129–131].

У розны час для падрыхтоўцы кадраў грэка-каталіцкага духавенства дзейнічалі епархіяльныя ўніяцкія духоўныя семінарыі ў г. Полацк («Беларуская») (заснавана ў 1806 г., сапраўды дзейнічала ў 1807–1839 гг., з перапынкам з 1812 па 1814 гг.), у м. Жыровічы Слонімскага павета («Літоўская») (1828–1839 гг.), а таксама цэнтры навучання ўніяцкіх святароў (т. зв. семінарыі) у м. Новы Свержань Мінскага павета (заснавана ў 1743 г., працавала ў 1744–1828 гг.), в. Лаўрышава Навагрудскага павета (1799–1828 гг.). Да таго ж, пры Віленскім папскім алюмнаце было вылучана 16 месц для навучання дзяцей ўніяцкіх святароў з ліку белага духавенства [27, s. 261]. Духоўныя навучальныя ўстановы ўніяцкай царквы (семінарыі, сярэднія і парафіяльныя школы) забяспечваліся, у асноўным, за кошт фундушавых даходаў [8, s. 146–157]. Дзяржаўнае грашовае ўтрыманне прадугледжвалася для асобных настаўнікаў уніяцкіх духоўных навучальных устаноў.

Такім чынам, статус уніяцкай царквы на беларускіх землях вызначаўся самадзяржаўнай уладай першапачаткова як складовай часткі каталіцкай (з 1770-х да 1820-х гг.), а потым праваслаўнай (з канца 1820-х да 1839 гг.) царквы. Прыхільнікі ўніяцкай канфесіі, пераважна з сялян, мяшчан, незаможнай шляхты лічыліся асноўнай базай для папаўнення вернікаў пануючай у Расійскай імперыі праваслаўнай царквы. Апынуўшыся ў арбіце барацьбы паміж каталіцкай і праваслаўнай канфесіямі за сферы ўплыву і вернікаў, уніяцкая царква прайшла складаны шлях да ліквідацыі ў 1839 г. і зліцця з праваслаўем.

Нетрывалы, нявызначаны імператарскай уладай статус уніяцкай царквы абумовіў адсутнасць яе сталага дзяржаўнага фінансавання. У цэлым, у канцы XVIII – 30-х гг. XIX ст. уніяцкая царква на беларускіх землях забяспечвалася пераважна за кошт уласных фундушавых крыніц даходаў. Асобныя грашовыя асігнаванні з дзяржаўнага казначэйства прызначыліся для ўтрымання вышэйшых уніяцкіх іерархаў, пенсійнага забеспячэння нязнач-

най часткі парафіяльнага духавенства, якая пазбавілася сваіх прыходаў пасля канверсіі ўніятаў у праваслаўе, а таксама нязначнай часткі кансісторскіх служачых, нешматлікіх асобных выкладчыкаў духоўных грэка-каталіцкіх навучальных устаноў.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Галанов, М. М.* Политика самодержавия в отношении униатов в годы царствования Павла I. Монография / М. М. Галанов. – Saarbuken: Sanktum, 2013. – 173 s.

2. *Лісейчыкаў, Д. В.* Штодзённае жыццё ўніяцкага парафіяльнага святара беларуска-літоўскіх зямель 1720–1839 гг. / Д. В. Лісейчыкаў. – Мінск: Медысонт, 2011. – 198 с., іл., табл., факсім.

3. *Лісейсыкаў, Д. В.* Святар у беларускім соцыуме: прасапаграфія ўніяцкага духавенства 1596–1839 гг. / Д. Лісейчыкаў. – Мінск: Беларусь, 2015. – 717 с., 16 л. іл., табл.

4. *Марозава, С. В.* Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596–1839 гг.) / С. В. Марозава. – Гродна: ГрДУ, 2001. – 352 с.

5. *Марозава, С. В.* «Сваёй веры ламаць не будзем…»: Супраціў дэўнізацыі ў Беларусі (1780–1839 гг.). Манаграфія / С. В. Марозава. – Гродна: ЮрСАПрынт, 2014. – 218 с.

6. *Філатава, А. М.* Уніяцкая царква і Полацкі сабор 1839 г. / А. М. Філатава // Канфесіі на Беларусі (к. XVIII–XX ст.) / В. В. Грыгор'ева, У. М. Завальнюк, У. І. Навіцкі, А. М. Філатава; навук. рэд. У. І. Навіцкі. – Мінск: «Экаперспектыва», 1998. – С. 5–20.

7. *Филатова, Е. Н.* Конфессиональная политика царского правительства в Беларуси 1772–1860 гг. / Е. Н. Филатова. – Минск: Бел. наука, 2006. – 192 с.

8. *Radwan, M.* Carat wobec Kościoła greckokatolickiego w zaborze rosyjskim 1796–1839 / M. Radwan. – Roma-Lublin: Polski instytut kultury chrześcijańskiej, 2001. – 504 s.

9. *Авчинникова, Ю. А.* Становление и деятельность Полоцкой униатской духовной консистории в годы архиерейства Иоасона Смогоржевского и Ираклия Лисовского / Ю. А. Авчинникова // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки. – 2009. – № 7. – С. 32–35.

10. *Мосейчук, Л. И.* Теологическое образование приходского униатского духовенства на белорусских землях в 1743–1839 гг.: автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / Мосейчук Людмила Ивановна; Белорус. гос. пед. ун-т им. М. Танка. – Минск, 2019. – 26 с.

11. Полное собрание законов Российской империи: собрание 1-е с 1649 по 12 декабря 1825 г.: в 45 т. – Санкт-Петербург: Типография 2-го отделения собственной его императорского величества канцелярии, 1830.

12. *Likowski, E.* Dzieje Kościoła Unickiego na Litwie i Rusi w XVIII i XIX wieku uważane głównie ze względy na przyczyny jego upadku / E. Likowski. – Poznań: nakł. Jarosława Leitgebra, 1880. – 495 s.

13. Акты, издаваемые Виленскою комиссиею для разбора древних актов: в 39 т. – Вильна: Тип. губерн. прав., 1865–1915. – Т. 16: Документы, относящиеся к истории церковной унии в России (1595–1839 г.). – 1889. – 704 с.

14. Описание документов архива западнорусских униатских митрополитов: в 2 т. – Санкт-Петербург: Синод. тип., 1907. – Т. 2: 1701–1839. – VIII, 1632 с.

15. *Галанов, М. М.* Политика российского самодержавия и позиция русской православной церкви в отношении католиков и униатов в годы царствования Павла I: дис. … докт. ист. наук: 07.0002 / М. М. Галанов // Санкт-Петербургский гос. эконом. университет. – Архангельск, 2014. – 536 л.

16. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 815.

17. *Свидерский, Л.* Иоанн Красовский, полоцкий униатский архиепископ / Л. Свидерский. – Витебск: Губернская типография, 1911. – 2, III, 437, 4 с.

18. *Толстой, Д. А.* Римский католицизм в России. Историческое исследование: в 2 т. / Д. А. Толстой. – Санкт-Петербург: тип. В. Ф. Демакова, 1876. – Т. 2. – VII, 438, 139 с.

19. *Семашко, И.* Записки Иосифа, митрополита Литовского, изданные императорской Академией наук по завещанию автора: в 3 т. – Санкт-Петербург: тип. имп. Академии наук, 1883. – Т. 1: Записки, собственноручно писанные Иосифом, архиепископом Литовским. – VIII, 745 с.; Т. 3: Важнейшие распоряжения преосвященного Иосифа, выписанные из протоколов Литовской духовной консистории. – IV, 1402 стб.

20. *Попов, А. Н.* Упразднение греко-униатских монастырей в Западной России 28 февраля 1828 г. / А. Н. Попов // Русская старина. – 1870. – Т. 1. – № 6. – С. 527–550.

21. *Морошкин, М. Я.* Воссоединение унии / М. Я. Морошкин // Вестник Европы. – 1872. – № 4. – С. 606–643.

22. *Шавельский, Г. И.* Последнее воссоединение с православной церковью униатов Белорусской епархии (1833–1839 гг.) / Г. И. Шавельский. – Санкт-Петербург: Тип. «Сельского вестника», 1910. – XXIV, 380, 82 с.

23. *Варадинов, Н. В.* История Министерства внутренних дел / Н. В. Варадинов. – Санкт-Петербург: тип. М-ва вн. дел, 1858–1862. – Ч. 3. Кн. 1: Период третий. С 19 ноября 1825 по 20 августа 1855 г. – 1862. – X, 777 с.

24. Полное собрание законов Российской империи: собрание 2-е с 12 декабря 1825 по 28 февраля 1881 г.: в 55 т. – Санкт-Петербург: Типография 2-го отделения собственной его императорского величества канцелярии, 1830–1884.

25. Извлечение из отчёта обер-прокурора Святейшего Синода за 1837 г. – Санкт-Петербург: Синодальная тип., 1838. – 123, 252, IV с.
26. Извлечение из отчёта обер-прокурора Святейшего Синода за 1838 г. – Санкт-Петербург: Синодальная тип., 1839. – 110, 131, IV с.
27. *Likowski, E.* Dziej kościoła greko-unickiego na Litwie i Rusi w XVIII i XIX wieku uważane głównie ze względu na przyczyny jego upadku: w 2 cz. – Warszawa: Gebethner i Spółka, 1906. – Cz. 1. – 277 s.

**(Дата подачи: 27.02.2025 г.)**

*Жэнь Сюэ*
Белорусский государственный университет, Минск

*Ren Xue*
Belarusian State University, Minsk

**УДК 327(510)+1(510)(091)**

## ОТРАЖЕНИЕ КОНФУЦИАНСКИХ УСТАНОВОК ВО ВНЕШНЕЙ ПОЛИТИКЕ КНР

## REFLECTION OF CONFUCIAN ATTITUDES IN THE FOREIGN POLICY OF THE PEOPLE'S REPUBLIC OF CHINA

*В статье оценивается влияние конфуцианства на внешнюю политику Китайской Народной Республики в 1949–2023 гг. Автором сделан вывод, что конфуцианские постулаты («мироустроительство», «следование середине», «великая гармония», нравственный подход к политике) использовались во внешней политике КНР в качестве вспомогательных элементов. Отмечено, что более активно конфуцианские установки, адаптированные к новым политическим и экономическим реалиям, стали использоваться во внешней политике КНР в начале XXI в.*
*Ключевые слова: Китайская Народная Республика; конфуцианство; внешняя политика; дипломатия; «пять принципов внешней политики»; суверенитет; развитие.*

*The article evaluates the influence of Confucianism on the foreign policy of the People's Republic of China in 1949–2023. The author concludes that Confucian postulates («world order», «following the middle», «great harmony», moral approach to politics) were used in the foreign policy of the PRC as auxiliary elements. It is noted that Confucian attitudes adapted to new political and economic realities began to be used more actively in China's foreign policy at the beginning of the 21st century.*
*Keywords: People's Republic of China; Confucianism; foreign policy; diplomacy; "five principles of foreign policy"; sovereignity; development.*

Провозглашение КНР 1 октября 1949 г. ознаменовало новый поворот в политическом развитии Китая. Победу одержали сторонники революции, выражавшие приверженность марксистским идеям и не нуждавшиеся в сохранении старых традиций и концепций.